Весці БДПУ. Серыя 1. 2018. № 1. С. 123–127.

УДК 821.162.1.В. Гамбровіч

# АДЛЮСТРАВАННЕ ІДЭЙ ЭКЗІСТЭНЦЫЯЛІЗМУ Ў «ДЗЁННІКУ» ВІТОЛЬДА ГАМБРОВІЧА

**А. А. Любчанка,**
*аспірант кафедры беларускай літаратуры і культуры БДПУ*

UDC 821.162.1.В. Гамбровіч

# REPRESENTING THE IDEAS OF EXISTENTIALISM IN «THE DIARY» OF WITOLD GOMBROWICH

**A. Liubchanka,**
*Post-Graduate Student of the Department of the Belarusian Literature and Culture, BDPU*

Паступіў у рэдакцыю 18.11.17.

Received on 18.11.17.

У артыкуле даследуецца адметнасць адлюстравання ідэй філасофіі экзістэнцыялізму ў «Дзённіку» польскага празаіка В. Гамбровіча. Выяўляецца спецыфіка разгляду аўтарам асноўных экзістэнцыяльных праблем: абсурднасці існавання, адчування адзіноты і экзістэнцыяльнага болю, свабоды суб'екта ў соцыуме, адказнасці індывідуума перад іншымі за свае дзеянні і інш.

Ключавыя словы: мемуарыстыка, аўтабіяграфічная проза, дзённік, экзістэнцыялізм, ідэя.

The article investigates the peculiarity of representing the ideas of existentialism philosophy in «The Diary» of the Polish prose-writer W. Gombrowicz. It reveals the specificity of the writer's viewing the main existential issues: the absurdity of existence, the feeling of loneliness and existential pain, the freedom of a subject in the society, the social responsibility of individuals for their actions,etc.

Keywords: memoir, autobiographical prose, diary, existentialism, idea.

Творчасць аднаго з найбольш выдатных польскіх пісьменнікаў Вітольда Гамбровіча ўжо шмат год з'яўляецца прадметам даследавання гісторыкаў і тэарэтыкаў літаратуры, роздумаў літаратурных крытыкаў і пісьменнікаў. Найбольш грунтоўныя даследаванні набыткаў польскага празаіка належаць Я. Блоньскаму («Studia o Gombrowiczu»), Е. Яжэмбскаму («Gra w Gombrowicza»), М. Вільку (з'яўляецца аўтарам прадмовы «Дзённіка»). У беларускім літаратуразнаўстве творы польскага празаіка даследаваны недастаткова. Усіх даследчыкаў, які б аспект творчасці В. Гамбровіча яны ні вывучалі, цікавіла пытанне станаўлення і адметнасці яго светапогляду. Нягледзячы на досыць вялікую колькасць літаратуразнаўчых прац, да канца не вывучанай застаецца сістэма поглядаў пісьменніка, якую нельга аднесці да пэўнай філасофскай канцэпцыі, дасюль не асэнсаваны вытокі яго філасофскіх поглядаў.

Многія даследчыкі называюць В. Гамбровіча экзістэнцыялістам. Важна вызначыць, ці можна аднесці В. Гамбровіча да прадстаўнікоў дадзенай філасофіі. Для гэтага неабходна вылучыць рысы экзістэнцыялізму ў поглядах празаіка. *Мэтай* нашага даследавання з'яўляецца супастаўленне філасофскіх поглядаў В. Гамбровіча з філасофіяй экзістэнцыялізму, а таксама асэнсаванне шляхоў станаўлення яго творчай асобы і вызначэнне асноўных філасофскіх ідэй пісьменніка. Матэрыялам для даследавання паслужылі мемуары пісьменніка – яго «Дзённік».

У апошнія гады пытаннем пошукаў В. Гамбровічам уласнага «я» на аснове «Дзённіка» займаліся польскія даследчыкі К. Крэнглевска («Problem podmiotowości w Dzienniku Witolda Gombrowicza»), А. Кавальчык («Pisarz na emigracji»), М. Маркоўскі («Czarny nurt. Gombrowicz, świat, literatura»), а таксама французскі гісторык літаратуры Ф. Лежон («Pakt autobiograficzny»). На аснове сістэматызацыі іх працы была створана метадалогія нашага даследавання, у якім зроблена спроба ўпарадкавання разрозненых ацэнак і прапанаваны ўласны погляд на творчую канцэпцыю польскага празаіка.

В. Гамбровіч пачаў пісаць «Дзённік» у 1953 годзе, калі знаходзіўся ў эміграцыі ў Аргенціне. Спачатку твор выдаваўся па частках у часопісе польскай эміграцыі «Культура» з дапамогай яго галоўнага рэдактара Ежы Гедройца. У тагачаснай камуністычнай Польшчы В. Гамбровіч быў забаронены, але часткі яго «Дзённіка» знаходзілі свайго чытача. Некалькімі гадамі пазней Е. Гедройц сабраў часткі твора ў адно выданне, і ў 1957 годзе выйшаў першы том «Дзённіка», дзе змяшчаліся публікацыі з 1953 да 1956 года. Пасля былі выдадзены яшчэ два тамы: у 1962 (ахоплівае публікацыі з 1957 да

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

1961 год), і ў 1966 годзе (часткі, напісаныя ў перыяд з 1961 да 1966 года, а таксама з 1967 да 1969 года). У 1969 годзе, знаходзячыся ў Францыі, В. Гамбровіч памёр. Такім чынам, «Дзённік» стаў самым буйным творам, які ахапіў 16 год жыцця пісьменніка, і ўвесь гэты час быў адлюстраваннем асобаснага і мастакоўскага станаўлення аўтара.

Назва «Дзённік» з'яўляецца фармальнай, бо твор нельга назваць аўтабіяграфіяй альбо дзённікам у вузкім жанравым значэнні. «Дзённік» не мае дат, часткі тэксту раздзяляюцца толькі назвамі дзён тыдня. Часавыя рамкі, якія прывязваюць да звыклай паўсядзённасці, не маюць значэння. Важную ролю адыгрываюць унутраныя метамарфозы пісьменніка: «Я з'яўляюся найважнейшай і, бадай, адзінай маёй праблемай» [1, с. 45] (Тут і далей цытаты з польскамоўных крыніц даюцца ў нашым перакладзе. – А. Л.). Гісторык польскай літаратуры Я. Блоньскі заўважае, што ў «Дзённіку» В. Гамбровіч часта здзіўляецца самому сабе, спрабуе знайсці тлумачэнне сваім учынкам, ставіць сябе пад пытанне, пераглядае раней адкінутыя ідэі [2, с. 20]. Адметна, што пісьменнік у творы выступае не толькі ў ролі аўтара. Польскі літаратурны крытык і даследчык творчасці празаіка А. Кавальчык выдзяляе тры ролі В. Гамбровіча ў «Дзённіку»: непасрэдна аўтар, апавядальнік і галоўны герой [3, с. 31]. Ролі галоўнага героя і апавядальніка даследчык называе «эмпірычнае "я" і "я" назіральніка», а самога аўтара – «"я" медытуючае» [3, с. 31]. Узяўшы на сябе некалькі функцый ва ўласным творы, В. Гамбровіч праводзіць грунтоўны самааналіз. Герой дзейнічае, апавядальнік канстатуе дзеянне, а аўтар аналізуе, ставіць пад сумненне, крытычна разважае. Так ён змагаецца з уплывамі рэчаіснасці і стварае ўласнае «я».

В. Гамбровіч «пускае» на старонкі «Дзённіка» чытача, дазваляе яму назіраць працэс станаўлення ўласнай свядомасці. Выступаючы ў ролі аўтара, ён спрабуе адказаць на важнае пытанне: чаму, калі «Дзённік» – гэта нешта асабістае і не аўтабіяграфічнае, ён усё ж публікуецца ў часопісе і шукае свайго чытача? В. Гамбровіч піша: «Я павінен паставіцца да гэтага дзённіка як да інструмента майго станаўлення адносна вас – прагнуць таго, каб вы зразумелі мяне вызначаным чынам, такім, які б даў магчымасць праявіцца майму (няхай з'явіцца гэта небяспечнае слова) таленту. Няхай гэты дзённік будзе больш сучасным і больш асэнсаваным, і няхай ён будзе прасякнуты ідэяй, што мой талент можа ўзнікнуць толькі ў сувязі з вамі, гэта значыць, што толькі вы ў стане ўзвысіць мяне да таленту, больш за гэта – стварыць яго ўва мне» [1, с. 97]. Празаік непасрэдна звяртаецца да чытачоў, у выніку чаго складаецца ўражанне, што «Дзённік» – гэта жывая размова, у якой задзейнічаны два бакі. У многіх частках твора прысутнічае эфект спантаннасці, няяснасці наступстваў тых ці іншых падзей (для аўтара ў тым ліку). Такім чынам, нечакана для сябе, пісьменнік адкрывае новыя бакі ўласнага існавання з адзінотай і неабходнасцю дзеяння – яскравымі прыкметамі філасофіі экзістэнцыялізму: «Дзеянне акрэсліць цябе і ўсталюе» [1, с. 231].

Польская даследчыца творчасці В. Гамбровіча К. Крэнглеўска адзначае, што згодна з поглядамі пісьменніка, на працягу жыцця дзейны чалавек атрымлівае толькі фрагменты рэчаіснасці, усведамленне яе сутнасці прыходзіць надта позна, а ўвесь патэнцыял свайго «я», не раскрываецца чалавеку амаль ніколі [4, с. 2]. Каб пашырыць свае інтэлектуальныя межы, В. Гамбровіч часта палемізуе сам з сабой і з поглядамі, якія падаюцца яму блізкімі: «Менавіта таму, што блізкія па змесце, яны становяцца чужымі. Калі ідэя ідзе ад кагосьці іншага, яна з'яўляецца прадуктам іншага стылістычнага, духоўнага вопыту» [1, с. 300]. У «Дзённіку» В. Гамбровіч многа ўвагі надае стварэнню ўласнага «я», намагаецца здабыць аўтаномію ў свеце людзей. Ён хоча валодаць уласнай свядомасцю, быць суб'ектам, але ніяк не аб'ектам. Таму аўтар з перасцярогай ставіцца да іншых індывідуальнасцей, да чужых, нават блізкіх для сябе, ідэй. Небяспеку В. Гамбровіч бачыць у тым, што прыняцце іншай індывідуальнасці можа зрабіць суб'ект непрадказальным для самога сябе. Для В. Гамбровіча прыняць чужую свядомасць – значыць стаць яе аб'ектам, пэўным чынам паддацца яе ўплыву. Суб'ект не можа прыняць іншага суб'екта, бо ў адной свядомасці недастаткова месца для суіснавання поглядаў двух суб'ектаў. Свядомасць суб'екта ў поўнай меры можа асэнсоўваць толькі сябе: «Усведамляю свае думкі, цела, уражанні, пачуцці, таму ўсё гэта для мяне існуе» [1, с. 303]. Існуе толькі тое, што паддаецца свядомасці суб'екта, у чым ён упэўнены ў межах свайго філасофскага, як яго назы-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

вае пісьменнік, «сціслага» мыслення. Але глыбокі сэнс ёсць у тым, каб ствараць уласную індывідуальнасць, гэтым правакуючы стварэнне іншых індывідуальнасцей [4, с. 4]. Такім чынам, паказваючы сур’ёзнасць уплыву суб’екта на суб’ект, В. Гамбровіч з нетрадыцыйнага боку разглядае экзістэнцыяльную праблему адказнасці адзінкі перад мноствам.

У многіх творах («Транс-Атлантык», «Фердыдурке», «Парнаграфія») В. Гамбровіч намагаўся пазбегнуць любых відаў «формы» (гатовай схемы паводзін і мыслення, якую навязвае ўлада, грамадства, мастацтва і сама гісторыя), у тым ліку – формы паводзін пры спробах суіснавання ў грамадстве і стварэння ўласнай свядомасці. У сваіх разважаннях пісьменнік ідзе да вытокаў «формы», заўважае, што мы пастаянна ствараем адзін аднаго, і часта пачынаем «існаваць праз іншых», скажаючы ўласнае «я».

Для В. Гамбровіча пытанне экзістэнцыяльнай свабоды ва ўласным выбары было прынцыповым, таму шмат старонак «Дзённіка» ён прысвяціў праблеме ўзаемадзеяння індывідуума, свядомага «я» з масай: «“Мы” ідзе толькі ад “я”» [1, с. 196]. Толькі індывідуальнасці маюць шанец утварыць трывалую супольнасць. Памылкова лічыць, што пэўны соцыум можна арганізаваць, падпарадкоўваючы і прыніжаючы індывідуальнасць кожнага яго прадстаўніка. Цаной індывідуальнасці нельга стварыць сталы соцыум, бо «аслабляючы індывідуальнасць, аслабляем народ» [4, с. 5].

Узаемадзеянне людзей у грамадстве турбуе пісьменніка ў многім таму, што чалавек – істота непрадказальная. Больш непрадказальнай за чалавека ён лічыць прыроду: «Ці можа зямны шар, які сам падвешаны, гарантаваць грунт пад нагамі?» [1, с. 501]. Гэтым пытаннем В. Гамбровіч указвае адначасова на сілу і хаатычнасць прыроды. Сам чалавек, нават свядомы суб’ект, не можа ў поўнай меры валодаць прыродай. У яго сілах толькі шукаць логіку ў хаосе, намагацца знайсці заканамернасці ў суадносінах прадметаў рэчаіснасці паміж сабой. Прырода пужае і адначасова натхняе пісьменніка сваёй уладкаванай спантаннасцю, бо такім ён бачыць свядомае «я»: жывым, гатовым змяняцца, але інтэлектуальна напоўненым і збалансаваным. Людзі могуць аказваць уплыў на прыроду, але толькі часова. У ёй захоўваюцца тыя сілы, якім яны нічога не могуць супрацьпаставіць.

Разам з прыродай адным з рухавікоў існавання В. Гамбровіч лічыць экзістэнцыяльны боль ад існавання: «Рэальны чалавек той, у каго баліць» [1, с. 415]. Аўтар адзначае, што баіцца нават болю мухі, паколькі боль не перастае быць болем, нават калі адносіцца да іншай істоты. Страх перад чужым болем абгрунтоўваецца цеснай сувяззю болю суб’екта з самім суб’ектам. Такім чынам, прымаючы боль іншага суб’екта, чалавек робіць чужы боль сваім. Пад словам «боль» можна разумець глыбокае перажыванне ўласнага існаваня з усімі яго цяжкасцямі. Толькі праз боль, на думку пісьменніка, можна праходзіць этапы асобаснага развіцця.

Часам падзеі ў «Дзённіку» падаюцца не зусім праўдзівымі. В. Гамбровіч дамагаецца гэтага эфекту стылізацыяй і архаізацыяй лексікі, бо польская мова пісьменніка адзначаецца многімі крытыкамі як багатая і разнастайная. У іншых выпадках аўтар апісвае падзеі сюррэалістычна, звяртаючы больш увагі на свае дзіўныя адчуванні пры сутыкненні з рэчаіснасцю. Гэта добра адлюстроўваецца ў двух адметных частах «Дзённіка», якія можна лічыць асобнымі апавяданнямі: «Сельскі дзённік» і «Дзённік Рыа Парана». Асаблівую ўвагу на значнасць гэтых частак з-за апісанняў дзіўнай паўсядзённасці звяртае перакладчык і літаратурны крытык М. Маркоўскі [5, с. 66]. У «Сельскім дзённіку» В. Гамбровіч апісвае сваё знаходжанне на вёсцы ў Паўднёвай Амерыцы, дзе вельмі спякотна. Праз словы «я растаю», «я пацею», а самае галоўнае – праз цяжкі для перакладу на беларускую мову «wypacam z siebie», што даслоўна можа абазначыць «выціскаю з сябе разам з потам», герой, якім з’яўляецца сам В. Гамбровіч, указвае на знікненне, «плаўленне» рамак паміж «я» і «не я» [5, с. 71]. Разам з няўпэўненасцю ва ўласнай свядомасці паўторамі слоў «як бы», «нібы» пісьменнік перадае поўную няўпэўненасць ва ўсім, што адбываецца навокал. Для героя ўсё рэальна толькі напалову, знаёмыя формы ўспрымання свету пачынаюць плавіцца, а ўсё атачэнне такое ж незнаёмае і раздзеленае на дзве часткі, як і яго «я».

Пошукі ўласнай свядомасці ў частцы «Дзённік Рыа Парана» працягваюцца героем з той жа актыўнасцю, толькі ў іншай жыццёвай сітуацыі. Ён некалькі доўгіх дзён плыве з кропкі А ў кропку Б на караблі, дзе акрамя руху і дажду нічога няма. Гэты карабель нібы аб’яднаўся з прыродай, авалодаў стыхіяй,

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

і адлучыў усіх пасажыраў ад удзелу ў жыцці. Пастаянны паўтор слова «плывем» – канстатацыя адзінай прыкметы жыцця ў гэтай адлучанасці. В. Гамбровіч зноў адкрывае новае ў сабе: «Нешта адбываецца па-за мной» [1, с. 374]. Знешняе адчуванне камфорту ў каюце кантрастуе з адчуваннем сваёй пасіўнасці і поўнай залежнасці ад руху карабля. Герой бяссільны, пакуль карабель рухаецца. Прыкладна такое ж уздзеянне могуць аказваць на чалавека прыродныя альбо гістарычныя працэсы. Чалавек, у сваю чаргу, пакідае свой нязначны след у гэтых працэсах: «Плывем з шумам і баразной за намі» [1, с. 375].

В. Гамбровічу не дае спакою знешняя бесклапотнасць паўсядзённасці. Ён жыве адчуваннем выбуху, чаканнем, калі ж «лопне струна», яго напружвае жыццё ў «імкненні да…» [1, с. 379]. «Сельскі дзённік» і «Дзённік Рыа Парана» аб'ядноўвае разгубленасць галоўнага героя, адчуванне разрыву рэчаіснасці, а таксама свайго «я» на часткі, экзістэнцыяльная трывога з-за поўнай абсурднасці быцця, назіранне за незвычайнымі бакамі паўсядзённасці.

Адным з бакоў пошуку ўласнай свядомасці В. Гамбровіч лічыў асэнсаванае ўспрыманне мастацтва (літаратуры, жывапісу, музыкі), якое варта разглядаць з пункту гледжання абсурднага чалавека. А менавіта, ставіць пад пытанне любыя прызнаныя шэдэўры, старацца паглядзець на іх знутры, без уздзеяння чужых поглядаў, каб зразумець іх важнасць ці бессэнсоўнасць для самога сябе. Пісьменнік праз свае тэксты задае правакацыйнае пытанне: а што, калі не будзе каму разглядваць мастацтва? Слова «разглядваць» у гэтым кантэксце мае значэнне «разумець». В. Гамбровіч мае на ўвазе, што чалавек без уласнага незалежнага погляду як на жыццё, так і на мастацтва, не захапляецца мастацтвам, а стараецца ім захапіцца. Такому чалавеку важна ўдакладніць, ці сапраўды ён бачыць перад сабой шэдэўр, каб пачаць яго хваліць. Адсутнасць свядомасці ва ўспрыняцці мастацтва ўласціва не толькі глядачам, але і самім мастакам. В. Гамбровіч лічыць, што сур'ёзнае мастацтва павінна быць голасам індывідуума. Гэту тэму, як адметную ў творчасці В. Гамбровіча, закранае польскі пісьменнік і гісторык мастацтва В. Карпіньскі [6, с. 104].

У частцы «Дзённіка» пад назвай «Супраць паэтаў» пісьменнік крытыкуе «чыстую паэзію», падкрэслівае яе абсурднасць і несамастойнасць. Ён лічыць паэтаў рабамі ўласнай творчасці, людзьмі, якія больш не выражаюць сябе, і, прыняўшы пэўны стыль, абядняюць паэзію, робяць яе фармальнай. В. Гамбровіч называе такую творчасць «паэзія для паэтаў». На думку пісьменніка, «паэты абараняюцца ад рэальнасці», губляюць шырыню кругагляду ў сваіх маленькіх гуртках і не адказваюць на покліч рэчаіснасці. Аўтар параўноўвае паэзію з цукрам з-за вялікай канцэнтрацыі ў ёй «салодкіх» паэтычных элементаў, розных клішэ, якія не маюць нічога агульнага з існаваннем чалавека. Сучасная паэзія – не больш, чым творы для саміх паэтаў альбо для аматараў паэзіі, для «сяброў». Іх мала хто правярае на трываласць, большасць бяздумна давярае іх важнасці. Для В. Гамбровіча творчасць – пастаянная барацьба з сабой і з усімі. Мастацтва павінна праходзіць праз выпрабаванні, «ацалець у руках ворага» [1, с. 767]. Толькі той твор, які не змог знішчыць нават яго «вораг», які нарадзіўся ў непарыўнай сувязі з існаваннем, можна назваць вартым. Мастацтва – адлюстраванне ўніверсальнага духу, створанае «не проста для асалоды і захаплення» [1, с. 770]. На яго думку, прызнанне вызначаных твораў шэдэўрамі – стварэнне духу калектыўнага, у многім блізкае да апладысментаў, калі адзін чалавек пачынае пляскаць, а потым астатнія падхопліваюць. Сам В. Гамбровіч акрэслівае сваю ролю так: «Я кандыдат на ролю мастака» [1, с. 772]. Для пісьменніка прызнанне сябе мастаком значыць прыняцце формы, якой ён актыўна супрацьстаіць. Мастак не павінен асацыіраваць сябе з мастаком, каб застацца жывым чалавекам, каб не страціць індывідуальнасць і сувязь з рэчаіснасцю. В. Гамбровіч параўноўвае мастацтва з рэлігіяй і адзначае: «Нават рэлігія памірае, калі становіцца рытуалам» [1, с. 775]. Так і мастацтва, пры фармальным і няшчырым да яго стаўленні, можа пераўтварыцца ў пазбаўленую сувязі з рэчаіснасцю, механічную дзейнасць.

Усе ідэі В. Гамбровіч адаптуе пад сябе, ён ніколі не прымае іх у чыстым выглядзе [2, с. 45]. Гэта датычыцца і пошукаў пісьменнікам «уласнай польскасці». Ён асэнсоўвае ўласную закінутасць у свет палякаў, разважае над сваёй адзінотай сярод суайчыннікаў. У многіх творах, а найбольш яскрава ў «Транс-Атлантыку», пісьменнік змагаецца са звычайнай, навязанай звонку і даўно састарэлай польскасцю палякаў, якую ён параўноўвае з латамі Дон Кіхота. Ён ніколі не адмаўляецца ад Польшчы, але адмаўляе сучасны вобраз

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Польшчы, заўсёды намагаецца зрабіць паляка не сынам А. Міцкевіча і Г. Сянкевіча, а самастойным чалавекам, інтэлектуальнай адзінкай. В. Гамбровіч абвінавачвае палякаў у пасіўным стаўленні да культуры, сляпым пакланенні яе традыцыйным ідэалам (у тым ліку агульнавядомым геніям) і ў «прыняцці сваёй веры ўжо гатовай» [2, с. 48]. В. Гамбровіч адзначае важнасць уласнага вопыту ў жыцці чалавека: «Няма іншага бажаства, акрамя таго, што нараджаецца з чалавека» [1, с. 611]. Кожны чалавек павінен асэнсаваць, пражыць свой шлях да самавызначэння, а не проста самавызначыцца, прыняўшы гатовую мадэль. Згодна з В. Гамбровічам, народ нельга ўсыпляць салодкімі песнямі і пастаяннымі ўспамінамі пра гераічнае мінулае (у гэтым ён бачыць хібы творчасці А. Міцкевіча, а пасля і Г. Сянкевіча). На думку аўтара, людзі праз уласны вопыт, няхай і з болем, могуць самастойна прыйсці да асэнсаванай самаідэнтэфікацыі.

Як паказвае аналіз «Дзённіка», В. Гамбровіч усімі сіламі імкнецца вызваліцца з-пад ціску гісторыі, на працягу якой індывідуальнасць замяшчалася пэўнымі шаблонамі. «Дзённік» з'яўляецца адказам на многія пытанні, звязаныя з сэнсам і ідэямі раманаў В. Гамбровіча. Ён можа паслужыць своеасаблівай метадалагічнай глебай для разумення творчасці пісьменніка. Тут адлюстроўваюцца самыя вострыя праблемы сучаснасці: дэфармацыя чалавека, ідэалагічны ціск, узаемадзеянне ў сістэме «чалавек і прырода», роля рэлігіі ў сучасным свеце, сутнасць мастацтва, дэмістыфікацыя культуры, нацыянальнае пытанне і інш. З філасофіяй экзістэнцыялізму твор аб'ядноўваюць развагі над сутнасцю жыцця ў поўнай адзіноце са сваёй свабодай, уласнай свядомасцю і экзістэнцыяльным болем, пытанне важнасці дзеяння, сцвярджэнне абсурднасці жыцця і паводзін людзей у цэлым.


### Літаратура

1. *Gombrowicz, W.* Dziennik 1953–1969 / W. Gombrowicz. – Kraków : Wydawnictwo literackie, 2013. – 1004 s.
2. *Błoński, J.* Forma, śmiech i rzeczy ostateczne. Studia o Gombrowiczu / J. Błoński. – Kraków : Wydawnictwo znak, 1994. – 284 s.
3. *Kowalczyk, A.* Pisarz na emigracji. Mitologie. Style. Strategie przetrwania / A. Kowalczyk. – Warszawa : Elipsa, 2005. – 533 s.
4. *Kręglewska, K.* Problem podmiotowości w Dzienniku Witolda Gombrowicza. Próba analizy / K. Kręglewska. – Kraków : Polisemia. – 2010. – № 1. – 35 s.
5. *Markowski, M.* Czarny nurt. Gombrowicz, świat, literatura / M. Markowski. – Kraków : Wydawnictwo literackie, 2004. – 410 s.
6. *Karpiński, W.* Książki zbójeckie. Szkice o literaturze emigracyjnej / W. Karpiński. – Londyn : Polonia Book Fund, 1988. – 245 s.



### References

1. *Gombrowicz, W.* Dziennik 1953–1969 / W. Gombrowicz. – Kraków : Wydawnictwo literackie, 2013. – 1004 s.
2. *Błoński, J.* Forma, śmiech i rzeczy ostateczne. Studia o Gombrowiczu / J. Błoński. – Kraków : Wydawnictwo znak, 1994. – 284 s.
3. *Kowalczyk, A.* Pisarz na emigracji. Mitologie. Style. Strategie przetrwania / A. Kowalczyk. – Warszawa : Elipsa, 2005. – 533 s.
4. *Kręglewska, K.* Problem podmiotowości w Dzienniku Witolda Gombrowicza. Próba analizy / K. Kręglewska. – Kraków : Polisemia. – 2010. – № 1. – 35 s.
5. *Markowski, M.* Czarny nurt. Gombrowicz, świat, literatura / M. Markowski. – Kraków : Wydawnictwo literackie, 2004. – 410 s.
6. *Karpiński, W.* Książki zbójeckie. Szkice o literaturze emigracyjnej / W. Karpiński. – Londyn : Polonia Book Fund, 1988. – 245 s.


РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ